# ГЛАБАЛЬНЫ ІНДЭКС ІНАВАЦЫЙ РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: АНАЛІЗ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**А. А. Якушэнка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўнівэрсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік В. Р. Віннік

*Раскрыта, что мэтай напісання дадзенай працы з'яўляецца аналіз глабальнага індэксу інавацый у кантэксце Рэспублıцы Беларусь.*

**Ключавыя словы:** ГІІ, Рэспубліка Беларусь, развіццё, інавацыі, GII, Inovations.

Глабальны інавацыйны індэкс (Global Innovation Index, GII) з'яўляецца прыладай, распрацаванай Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці, Універсітэтам Карнела і Інстытутам Інсеты, якая прызначана для вымярэння інавацыйнай актыўнасці і магчымасцей у больш чым 132 краінах свету. Рэйтынг адзначае інавацыйную прадукцыйнасць, складзеную на грунце 80 розных паказчыкаў, кожны з якіх пэўным чынам уплывае на GII. Індэкс імкнецца не толькі да абагульненай адзнакі інавацыйнай прадукцыйнасці, але і да прадастаўлення краінам прыладаў для аналізу і ўзвядзення іх інавацыйнай сістэмы. Ён дапамагае краінам выявіць свае моцныя і слабыя бакі ў вобласці інавацый, а таксама вызначыць вобласці, у якіх яны змогуць выкарыстоўвацца для паляпшэння свайго інавацыйнага патэнцыялу. З дапамогай GII краіны здольны не толькі вымераць свае поспехі ў галіне інавацый, але і атрымаць досвед іншых краінаў з пазыкай лепшых практык і стратэгій. Такім чынам, GII з'яўляецца важнай прыладай для міжнароднага супрацоўніцтва і абмену ведамі ў галіне інавацый.

Для аналізу GII Беларусі звярнемся да статыстыцы за апошнія гады (2018–2023 гг.). Статыстыка дазволіць вызначыць змены ва ўзроўне GII Беларусі з цягам часу (гл. табліцу).

**Дынаміка месца Рэспублікі Беларусь у рэйтынгу Глабальнага індэкса інавацый**

| Год | Індэкс GII | Месца ў рэйтынгу |
|---|---|---|
| 2018 | 29,35 | 86 |
| 2019 | 32,07 | 72 |
| 2020 | 31,27 | 64 |
| 2021 | 32,6 | 62 |
| 2022 | 27,5 | 77 |
| 2023 | 26,8 | 80 |

Такім чынам, мы бачым, што з аднаго боку нашае месца ў рэйтынгу спачатку моцна заняпала з цягам год з 86 да 62, але потым распачало пакрысе аднаўляцца з 62 да 80. У тый жа час мы бачым, што непасрэдна нашаму ідэксу вогуле не ўласціва стабільнасць. Індэкс GII Беларусі моцна гойдаецца то ўгару, то ўніз, але ва ўсялякім выпадку па выніках гэтых рухаў мы назіраем тэндэнцыю змяншэння індэксу. З такіх лічбаў можна зрабіць выснову, што змены ў месцы рэйтынгу ў вы-

падку Беларусі адбываюцца не праз надвышэнне нашага рэйтынгу, а праз заняпад індэксу ў суседзяў па рэйтынгу. Суседзямі Беларусі па рэйтынгу з'яўляліся: 2018 г. – Інданэзія і Дамінікана; 2019 г. – Брунэй і Аргентына; 2020 г. – Грузія і Туніс; 2021 г. – Паўднёвая Афрыка і Грузія; 2022 г. – Ямайка і Іорданія; 2023 г. – Туніс і Казахстан. На жаль, краіны, пералічаныя вышэй, не з'яўляюцца дужа інавацыйна развітымі.

Тым не менш усё гэта проста лічбы, якія нічога ня важаць, калі іх не параўноўваць, таму разглядзім поспехі ў рэйтынгу нашых геаграфічных суседзяў для прыкладу (рыс. 1).




*Рыс. 1.* Дынаміка Глабальнага індэкса інавацый Рэспублікі Беларусь
і краін-суседзяў

Такім чынам, можам вызначыць, што на дадзены час ГІІ Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца як мага больш нізкім сярод усіх ГІІ суседзяў, ды і вогуле самым нізкім за ўвесь час вымярэння ў Беларусі. Можна таксама зрабіць выснову, што дадзеная тэндэнцыя заняпаду ГІІ дакладнее за ўсё захаваецца і пры бліжэйшых наступных вымярэннях. Сярод усіх агледжанных вышэй краін падобнае ўласціва хіба што Расіі, індэкс ГІ якой імкліва падае з 2020 г.

Па выніку можно вызначыць, што дадзеная тэндэнцыя вядома з'яўляецца благой і абавязкова патрабуе выпраўлення. Сачыць за паказчыкам Глабальнага індэкса інавацый GII важна па такіх падставах, як адзнака канкурэнтаздольнасці інавацый, эканомікі і ўзроўню жыцця, стымуляванне развіцця, прыцягненне інвестыцый, развіццё навуковых даследаванняў, параўнанне з іншымі краінамі. Каб палепшыць становішча ўсяго вышэй пералічанага, Беларусі трэба пашыраць супрацоўніцтва менавіта з развітымі суседзямі і краінамі свету, якія сапраўды маюць свой патэнцыял і здольны праз досвед і тэхналогіі дапамагчы Беларусі раскрыць свой, бо як кажуць беларускія прымаўкі: 'З кім спазнаешся, такім станешся'.

Вядома, для паляпшэння дадзенага становішча Беларусь гэтаксама мусіць ужыць свае моцныя бакі з улікам мясцовых асаблівасцяў і складанасцяў. Напрыклад, Беларусь, як краіна ня дужа багатая на карысныя выкапні, затое багатая на выдатных людзей, можа палепшыць свой рэйтынг праз узмацненне «анлайн». Накірунку дзейнасці, пачаўшы развіваць такі сучасны накірунак як ІТ. Сюды можна гэтаксама залічыць дзейнасць у сферы паслуг, фінансаў і нерухомасці, транспартнай сферы, сферы гандлю і г. д. Для моцнага інавацыйнага руху наперад эканоміка Беларусі мае

патрэбу ў прыняцці больш рашучых, чым раней, дзеянняў па стварэнню дабратворнай падмурку для паспяховай інавацыйнай дзейнасці – ключавога фактару ўстойлівага развіцця краіны. Гэтыя меры павінны датычыцца актыўнага ўцягвання прадпрымальніцкага сектара ў інавацыйную дзейнасць, забеспячэння спрыяльных умоў для стварэння, распаўсюджвання і ўкаранення інавацый, узмацнення дзяржаўнай фінансавай і рэгулятарнай падтрымкі наватараў, развіцця рынкаў, матывацыі інвестараў, забеспячэння даступнасці ініцыятараў інавацый да крэдытных рэсурсаў банкаў і фондаў і інш.

Спіс літаратуры


1. Global innovation index Belarus, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020/by.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
2. Global innovation index Latvia, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
3. Global innovation index Lithuania, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020/lt.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
4. Global innovation index Poland, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020/pl.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
5. Global innovation index Ukraine, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020/ua.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
6. Global innovation index Russian Federation, 2020 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2020/ru.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
7. Resume. Global innovation index 2023 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/publications/ru/details.jsp?id=4680&plang=RU – Дата доступу: 05.03.2024.
8. Resume. Global innovation index 2022 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://tind.wipo.int/record/46618?v=pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
9. Resume. Global innovation index 2021 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/edocs/pubdocs/en/wipo_pub_gii_2021/by.pdf. – Дата доступу: 05.03.2024.
10. Global innovation index 2019 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/publications/ru/details.jsp?id=4434&plang=RU. – Дата доступу: 05.03.2024.
11. Global innovation index 2018 // САІЎ. – Рэжым доступу: https://www.wipo.int/publications/ru/details.jsp?id=4330&plang=RU. – Дата доступу: 05.03.2024.


## ИССЛЕДОВАНИЕ РОЛИ СНА В ЖИЗНИ СТУДЕНТОВ

**Д. В. Фоменок, Е. А. Кузнецова, С. А. Храмченко**

*Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого», Республика Беларусь*

Научный руководитель: Е. Н. Карчевская

*Сон является одной из фундаментальных физиологических потребностей каждого человека. От его качества напрямую зависит психическое и соматическое здоровье человека, его способность к обучению и трудоспособность. Исследование распространенности расстройств сна и факторов, влияющих на их развитие, поможет в профилактике, диагностике и лечении данных состояний.*

**Ключевые слова:** социологическое исследование, сон, студенты, здоровый образ жизни.

Объект – студенты ГГТУ им. П. О. Сухого и англоязычные студенты зарубежных учебных учреждений.

Предмет – субъективная оценка студентами качества сна и последующее выявление основных факторов, влияющих на сон.